ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЕЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ДЭКАДНІК

СЭКТАРУ КНІГАГАНДЛЮ ДзВБ

№ 2 (8) | РАССЫЛАЕЦЦА ПА ЎСЁЙ СЕЦІ КНІГАГАНДЛЮ ПА РАЗЬВЁРСТЦЫ | АДРАС РЭДАКЦЫІ Менск, Пляц Волі 5, тэл. № 7—41 | 20 студзеня 1932 г.

АПЭРАТЫЎНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

ВЫШЛІ З ДРУКУ ЗА ПЕРШУЮ ДЭКАДУ СТУДЗЕНЯ

ПАРТМАСПАЛІТСЭКТАР.

Шэйман М.—Агнем і крывею ў імя бога. 6,5 арк. т. 5.000 ц. 60 к.

Кніжка напісана папулярна. Без яе нельга абыйсьціся ў нашай пропагандыцкай антырэлігійнай працы.

Чарвякоў В., доктар.—Слуцкія муміі. 5 арк. т. 3.000 ц. 80 к.

Грунтуючыся на строга-навуковых досьледах падаюцца вынікі ўскрыцьця і дасьледваньня мошчэй „вядома младзенца Гаўрыіла Слуцкага і княгіні Софіі“, даступная шырокім колам чытачоў.

Пятухоў М.—За ўсеагульнае тэхнічнае навучаньне ўдарнікаў. 2 ар. т. 5.000, ц. 10 к.

Завочны Комуністычны Унівэрсытэт. Гісторыя міжнароднага рэв. руху № 1. 5,5 арк. т. 3.000, ц. 50 к.

[С]ЕЛЬГАССЭКТАР

[Ц]ецікаў М. Л.—Веснавое разводзьдзе і яго значэньне для заліўных сенажацяў 2,5 арк. т. 5.000, ц. 10 к.

Чэмелеў В.—Харчовыя грыбы і іх выкарыстоўваньне. $3^1/_4$ арк., т. 2000, ц. 50 к.

Чэмелеў В.—Як разводзіць насеньне кармавых караньплодаў. Выд. папоўненае. $3^1/_4$ арк., т. 12.000, ц. 25 к.

Юдзін А.—Правілы догляду сельска-гаспадарчых машын. $3^1/_4$ арк., т. 10.000, ц. 30 к.

Знаёміць з новымі машынамі. Разьдзелы: устаноўка плугоў, трактарныя плугі, пільцівізатары, буккер, падрыхтоўка поля. сартаваньне ільну і г. д. Напісана ясна і папулярна. Разьлічана на шырокія масы колгасьнікаў і колгасныя кадры.

Сяргееў М.—Малако. догляд, сэпарыраваньне і дасьледваньне на р[а]зьліўных пунктах. 4 арк., т. 10.000, ц. 25 к.

Напісана папулярнаю моваю, разьлічана на малакаведаў колгасаў і саўгасаў.

Арлоўскі І.—Як складаць кармавыя рацыёны для малочных кароў. 3 арк., т. 12.000, ц. 25 к.

Круглоў В., аграном.—Выконваем пляны па сацыялістычнай жывёлагадоўлі 3 арк., т. 7.000., ц. 20 к.

Адпавядае чарговым задачам сацыялістычнае жывёлагадоўлі ў БССР. Напісана папулярна. Разьлічана на колгасьнікаў.

Вардомскі К.—Як падвысіць удойнасьць каровы, 1,5 арк., т. 7.000, ц. 10 к.

ВАЙСКОВЫ СЭКТАР.

„Настаўленьне РСЧА“. Тактычнае вывучэньне і манэўры. (1929 г.) 8,5 арк., т. 3.000, ц. 45 к.

Безукладнікаў.—Як зьберагчы здароўе ў час паходу. $4^1/_4$ арк. т., 5.000, ц. 30 к.

„Кіраўніцтва па службе хэмічных каманд ТД Авіяхэму“. 6,5 арк. т., 3.000, ц. 20 к.

„Чырвонаармейскі палітпадручнік“.—Агульны палітычны курс разьдз. 1 Капіталістычная і соцыялістычная сыстэмы гаспадаркі. $2^3/_4$ арк. т. 4.000, ц. 25 к.

МАСТАЦКІ СЭКТАР.

Лынькоў М.—Апошні зьверыядавец. Выд.-II. 9,5 арк. т. 3.000, ц. 90 к. Кніжка дае малюнак жыцьця на гуце.

Ляшко.—Доменная печ. $10^1/_4$ арк. т. 3.000, ц. 70 к.

Сташэўскі.—Пад местачковым месяцам. (Аповесьць) 10 арк. т. 3.000, ц. 1 руб.

У рэальных фарбах паказана местачковае жыцьцё, перабудова мястэчка, клясавая барацьба ў процэсе гэтай перабудовы і перамога новага.

Крапіва.—Хвядось—Чырвоны нос. 6 арк., т. 3 000 ц. 1 р. 55 к. Казка Крапівы высьмейвае багэму ў літаратурным жыцьці.

Мікуліч.—Чорная вірня. (Новэлі). 8 арк. т. 5.000, ц. 90 к.

Гірчак Е.—Хвілёвізм. (Спроба палітычнай [illegible] ... барацьбе [illegible] нацыяна[лізму] ... кага сьветапогляду [укр]аінскага камуніста Хвілевага.

ЮНАЦКА-ДЗІЦЯЧЫ СЭКТАР

Івіч А.—Пяць уцекаў. 5,5 арк. т. 5.000, ц. 30 к.

Знаёміць, як змагаліся за царом з няволяю, як зьняволеныя ўцякалі з выспаў. Напісаны папулярнаю моваю і чытаецца з захапленьнем.

Ляшэвіч Э.—Сьвятло з гораду. Маладыя тэхнікі. (Апавяданьні). $5^1/_4$ арк. т. 5 000, ц. 45. к.

Кніжка знаёміць чытача, як самому зрабіць радыепрыемік. Карысна школьнікам старэйшага ўзросту.

Ногін В.—У краіне палярнага холаду. $5^1/_4$ арк. т. 5.000 ц. 55 к.

Аўтар апісвае ссылку, дзе ён прабыў некалькі год і дае прыгожае апісаньне краю.

Ракіцкі П.—Усё жывое з аднаго кораню. $4^3/_4$ арк. т. 5.000 ц. 25 к.

Знаёміць у популярнай форме з пытаньнямі, якія зьвязаны з гісторыяй зямлі і паходжаньнем жывёльнага сьвету.

Сьміроноў Н.—На трактары. 2 арк. т. 6.000, ц. 10 к.

Знаёміць з тым, як Сталінградзкі завод зрабіў уплыў на бяспрытульную моладзь, як уцягваў яе ў працу і зусім перавыхаваў.

Ляшэвіч В.—Парады маладому тэхніку. (162 практычныя парады і рэцэпты з 39 мал.) 6 арк. т. 7.000 ц. 35 к.

Кніжка дапамагае дзіцячым тэхнічным станцыям і гурткам у іх працы па тэхніцы.

Разанаў А.—Самалёт. 4 арк. т. 6.000, ц. 35 к.

Чытаецца з вялікаю цікавасьцю і дае ў лёгкай форме сапраўднае разуменьне канструкцыі самалётаў.

Стэрлігаў У.—На самалёце ў Амэрыку. 5,5 арк. т. 4.000, ц. 35.

Падрабязна апісваюцца ўсе цяжкасьці пералётаў. Чытаецца з вялікім захапленьнем.

ПАСТУПІЛА Ў ПРОДАЖ

СТАЛІН

ПЫТАНЬНІ ЛЕНІНІЗМУ

Т. 20000. Стар. 564. Цана 1 р. [illegible] к.

ТЭХСЭКТАР

Сафронаў Д. Інж.—Даведнік раманцера. 3 арк., т. 3.000, ц. 75 к.

ВУЧПЭДСЭКТАР

Ператварыць БССР у краіну суцэльнай [illegible] ... БССР. 1 арк. [illegible] ... Інфармацыйна-метадычны ліст № [illegible] ... т. 3.000, ц. 07 к.

Мяшалкіна-Сіўка,—Лукіна Л.—Будзь гатоў. (Кніжка на чытаньне для 1-га году навуч. вясковых першапачатковых школ). Вып. II-і. 9 арк., т. 100.000, ц. 52 к.

Бурдзянскі І. Н.—Асновы рацыяналізацыі вытворчасьці. Падручнік для комвузаў. рабочых унівэрсытэтаў і сеткі профтэхасьветы. Выд. II-е дапоўненае. (І-е выданьне прэміравана НКАсьветы РСФСР) 25,5 арк. т. 10.000, ц. 1 р. 70 к.

Бярэзін А. А. і інш.—Рабочая кніга па прыродазнаўству (V год навуч[аньня] ... рэдакц. Б. В. Усесьвяцкага і Б... цява. 16,5 арк. т. 40.000, ц. 1 р.

Сінявока і інш.—Па Ленінскім ... (Рабочая кніга для III году навучаньня ... чатковай школы ФЗС, КС і ШКМ). В... 14 арк. Тыраж 130.000, ц. 50 к.

Вальфсон Б. і Гак Г.—Нарыс гіс[тарыч]нага матэрыялізму. Дапаможнік для с... школы і марксыцка-ленінскіх гу[ртк]оў 20¼ арк., т. 20 000 ц. 95 к.

ПЭРЫЯДСЭКТАР

„Комуністычнае выхаваньне“ № 10 1931 год, 9,5 арк. т. 5.000, ц. 95 руб

„Маладняк“. Кніжка № 10 за 193[1] 12,5 арк., т. 3.000, ц. 50 к.

Выйшлі з друку польскай мо[вай]

МАСПАРТПАЛІТС[ЭКТАР]

Унукаў.—Ці страшна нам ... 2 арк. т. ... ц. 20 к.

СЕЛЬГАССЭКТ[АР]

Скамарохаў.—Беражыце быдл[а] ... $^3/_4$ арк., ц. 06 к.

Маскалёў.—Малочная гас[падарка] ... жывецкай паласе. $1^1/_2$ арк. ...

ВУЧПЭД[СЭКТАР]

Хімава.—Першы Уда[р] ... III-га году навучаньн[я] ...

ДРУКУЮЦЦА І ХУТКА ВЫЙДУЦЬ

МАСПАРТПОЛІТСЭКТАР

Жланаў М. і Тапэха Л.—Японскі імпэрыялізм у Манчжурыі.

Брошура популярна передае ўвесь комплекс пытаньняў зьвязаных з апошнім наскокам японскага імпэрыялізму ў Манчжурыю. Даюцца некаторыя гістарычныя і гэографічныя даведкі, а таксама зьвесткі пра экономічнае становішча і прыродныя багацьці Манчжурыі, падкрэсьліваюцца інтарэсы, якія Японія мае ў Манчжурыі і мэты зьвязаныя з захватам.

Казанцаў І.—Усеагульнае пачатковае навучаньне, і клясавыя змаганьні на вёсцы.

Кніжка вельмі цікавая і карысная культармейскаму актыву.

Ляс М. і Тур.—Гвардыя гінучага міру.

Кніжка ў цікавай форме памфету, востра паказвае твар міжнароднага социял-фашызму ягоную ролю здрадніка пролетарыяту і вернага абаронцы капіталізму.

Левентант.—За безбожнае ўдарніцтва.

Кніжка расказвае практыку антырэлігійнае працы на заводах імя Леніна і Пятроўскага. У ёй паказана, як трэба ўвязаць рэлігійную працу з канкрэтнымі вытворчымі задачамі, з выкананьнем промфінпляну.

Асіповіч М.—За соцыялістычную перабудову быту.

Вельмі карысная рабочым, актывістам страховай і профэсыйнай работы. Яна паказвае, якія магчымасьці маюць рабочыя каб захаваць сваё здароўе і сілу. Напісана проста і зразумела.

Ланцуцкі Ст.—Успаміны.

Кніга адлюстроўвае змаганьне польскаго пролетарыяту з буржуазіяй у розныя пэры... (Да імпэрыялістычнай вайны і пасьля); ...зе канкрэтных прыкладаў выкрываец... ...дніцкая роля П..С і паказваецца про... ...росту уплываў кампартыі на рабочыя масы Польшчы.

Германікус—Нямецкі нацыянал-фашызм.

Кніжка паказвае клясавыя дачыненьні ў сучаснай Нямеччыне і дапамагае чытачу разабрацца ў палітычных абставінах і зразумець. палітыку Нямецкага манапол. Капіталізму, нац. соц. фашыстых (с-д), паказваюцца задачы і пэрспэктывы КПН у змаганьні за комуністычную рэволюцыю ў Нямеччыне. Напісана лёгка і чытаецца з вялікаю цікавасьцю. Для шырокага партыйна-комсамольскага і проф...

Р...
і с. ...
про...

...ЕЛЬГАССЭКТАР

...аў А.—Памятка разьязнога мэханіка ...ад з расійскае мовы). Патрэбна мэ... ...кваліфікаванаму трактарысту, бры... ...адміністрацыі саўгасаў МТС, Праў... ...колгасаў.

...н А. І.—Культура канапель на Бела... ...апісана папулярна, даступна і мала... ...наму калгасьніку.

...оў В. М.—Выканаем пляны па ства... ...замацаваньні соцыялістычнае жывё... ...кі.

...вечана чарговым задачам соцыялі... ...жывёлагадоўлі ў БССР. Напісана ...на. Для колгасьнікаў.

2 ...еў—Цыан-амід ваненю.

...дапаможа агранамічнаму пэрсана... плу... саўгасаў і колгасьнікам паглы...

Гус... ў галіне сельска-гаспадар...

Мічэр... ...чыць правільна ўжываць ...наеньні гл...

...сявалкі. Прамысловая сушка бульбы.

Леме... і пытаньне закранутае ў

3 арк ...ьнае значэньне для БССР.

Ан... ...я бульбяных раёнаў.)

1 арк. ...С.—Машына ў сельскай гас... ...аклад з расійскае мовы.) ...папулярна, разьлічана на

Выдавец— ...ёміць з рознымі сель... ...мамі, агітуе за распаў

Друк. імя Сталі...

Агінскі Н. Л.—Трактар „Фордзон“ і „Фордзон—Пуцілавец“. (Пераклад з расійскае мовы).

Для кваліфікаваных працаўнікоў.

Сафараў Г.—Сельска-гаспадарчая эканомія і сацыялістычная рэконструкцыя. (Пераклад з расійскае мовы).

Напісана популярна, даступна кожнаму практычнаму работніку, асабліва партактыву.

Пешкін І.—Савецкае машынабудаўніцтва. Пад агульнай рэдакцыяй Э. Квірынга. (Пераклад з расійскае мовы).

Патрэбна вясковаму, партыйнаму, камсамольскаму і колгаснаму актыву. Знаёміць галоўным чынам з агульным машынабудаўніцтвам, але закранае і сельска-гаспадарчае.

Нюрынаў А. А.—Асновы вэтэрынарыі. (Пераклад з расійскае мовы).

Можа быць добрым падручнікам для жывёлагадоўчых тэхнікумаў і колгаснага актыву пры аўладаньні тэхнікаю гэтае справы.

Юдзін А. Д.—Правілы догляду сельскагаспадарчых машын. (Пераклад з расійскае мовы).

Разглядае сельска-гаспадарчыя машыны: трактарныя плугі, культызатары, буккеры, ільнасартоўкі і г. д. Напісана популярна, можна раіць шырокім колам колгасьнікаў і колгасным кадрам.

Сьмірноў А. П.—Выраб слонечніку на сілос.

Напісана популярнаю і зразумелаю моваю Разьлічана на масавага чытача-колгасьніка.

Гуржы Р. С.—Пэрспэктывы для плодаовашчнай кансэрвнай прамысловасьці ў БССР.

Знаёміць з магчымасьцю і даводзіць неабходнасьць арганізацыі консэрвнай прамысловасьці ў БССР. Для агрападрыхт...нага актыву.

Шляхам перамог. (Зборнік).

Колектыўная праца ўдарнікаў колгасных і саўгасных палёў. У мастацкай форме перадаюцца ўражаньні пра нашы дасягненьні на фронце соцыялістычнага будаўніцтва, што аўтары бачылі ў час экскурсый. Творы знаёмяць з Сталінградзкім трактарным заводам, саўгасам „Гігант“ і інш.

Есін.—Электрофікацыя.

Напісана популярна. Даступна чытачу, што знаём з асновамі электрофікацыі Разьлічана па спэцыялістых, якія працуюць у сельскай гаспадарцы, на сельска-гаспадарчыя тэхнікумы, саўгасвучы, карысна і студэнтам ВНУ, як дапаможнік.

Чабатароў.—Паразітарныя захворваньні буйной і дробнай рагатай жывёлы. Напісана популярна і разьлічана на шырокія колы рабочых саўгасаў і колгасьнікаў. Патрэбна ўсім гуртком па падвышэньню кваліфікацыі рабочых саўгасаў і колгасьнікаў, асабліва ў соцыялізаваных гаспадарках.

Броўкін.—Разьмеркаваньне ўраджаю і даходаў умацуе колгас „Чырвоны ўдарнік“.

Паказваецца, як разьмеркаваньне прыбытку ўплывае на арганізацыйнае замацаваньне колгасаў.

Рабочая програма і палажэньне аб арганізацыі працы ў МТФ СССР і БССР.

Брошура зьмяшчае пастанову Колгасцэнтру і Малколгасцэнтру СССР пра організацыю працы ў малочна-таварных фэрмах СССР і палажэньне пра арганізацыю працы ў жывёлагадоўчых малочна-таварных фэрмах БССР, зацьверджаная Колгасцэнтрам БССР і ўпаўнаважаным Колгасцэнтру СССР. Высьвятляюцца пытаньні: пра зьдзельшчыну, улік працы, організацыю брыгад, унутраны распарадак на МТФ, абавязкі работнікаў МТФ, прэміраваньні, вытворчыя нарады, соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Патрэбна кожнаму працаўніку МТФ, студэнтам сельскагаспадарчых і жывёлагадоўчых тэхнікумаў і ВНУ, павінна быць у кожным колгасе.

Палажэньне аб організацыі працы і ўнутраным парадку на СТФ.

Брошура зьмяшчае прыкладнае палажэньне зацьверджанае Колгасцэнтрам СССР для сьвінагадоўчых колгасных таварных фэрм. Зьмест: організацыя брыгад і замацаваньне колгасьнікаў на рабоце у СТФ, унутраны распарадак на фэрме, абавязкі ўсіх працаўнікоў, правілы бясьпекі. Нормы выпрацоўкі і зьдзельная ацэнка працы на СТФ, прэміраваньне і вылічэньні за якасьць працы на СТФ. Патрэбна працаўнікам фэрмаў, студэнтам сьвінагадоўчых тэхнікумаў і ВНУ, курсантам па сьвінагадоўлі.

Балоцін.—Сілос і сіласаваньне кармоў у буйных сельскіх гаспадарках.

Напісана зразумелаю моваю, агітуе за ўкараненьне сілосам. Патрэбна студэнтам сельска-гаспадарчых тэхнікумаў і ВНУ і сельска-гаспадарчым спэцыялістым.

Сяргееў.—Малако. (Пераклад з расійскае мовы). Напісана популярнаю моваю. Для тых, хто мае дачыненьне да малака, пра догляд яго, пра сэпарыраваньне і дасьледваньне малака і ад чаго яно псуецца.

Задача: дапамагчы практычным працаўнікам былдлячых двароў і зьліўных пунктаў.

Бахбардт А. І.—Хаваньне малака і догляд яго. (Пераклад з расійскае мовы).

У популярной форме падае ўсе працэсы, якія патрэбны пры захаваньні малака. Брошура вельмі патрэбная цяпер, і асабліва ў БССР, дзе шмат саўгасаў і колгасаў маюць малочны ўхіл.

Балкавец Л.—Дзікія лекавыя травы інш. карысныя расьліны.

Кніжка вельмі патрэбная. Популярнасьцю апісаньня кожнае расьліны даступна малападрыхтаваным чытачом і перш-на-перш тым, хто займаецца, або будзе займацца зьбіраннем рознае лекавае травы.

Уласенка і Шышуноў.—За вынаходніцтва, рацыяналізацыю і масавае дасьледніцтва. (Пераклад з расійскае мовы).

Брошура высьвятляе ролю дасьледніцтва, даючы практычны падручнік, як трэба гэту справу організаваць.

Шыперка Эд.—Тарпяное ўгнаеньне.

Брошура дапаможа саўгасам і колгасам ўжываць тарпяное ўгнаеньне.

Галахаў, аграном.—Шкоднікі ільну і змаганьне з імі. (Пераклад з расійскае мовы).

Брошура карысная, асабліва для ільнаводных раёнаў.

Танарыо В.—Стукі ў рухавікох трактароў „Фордзон“ і „Ф. П.“ (Пераклад з расійскае мовы).

Напісана популярнаю моваю. Карысна кадрам МТС.

Паладзіна О. К.—Практычнае кіраўніцтва па бактэрыолёгіі малака і малочных прадуктаў. (Пераклад з расійскае мовы).

Карысна і неабходна спэцыялістам малочнай справы, тэхнікумам, малочным заводам па перапрацоўцы масла.

Скарупскі Э. Памятка трактарыста,—рулявога, (Пераклад з расійскае мовы). Брошура патрэбна трактарыстам (галоўным чынам рулявым), вучыць даглядаць трактар, падае весткі пра змазваньне і гаручыя матэрыялы. Разглядаюцца пытаньні бясьпекі і супроцьпажарнае аховы.

Штрэкер—Лугавыя злакі. (Пераклад з нямецкае мовы).

Харчовая проблема, падрыхтоўка кадраў ў галіне організацыі харчовай плошчы, луганаўства і г. д. стаіць у нас востра. Кніга надзвычай патрэбная.

Фролаў Ф. П.—Паліва для трактароў. (Пераклад з расійскае мовы).

Кніжка карысная трактарысту, рабочым саўгаса, МТС і колгасьнікам.

Юфэраў, проф.—Сельска гаспадарчыя машыны. (Пераклад з расійскае мовы).

Знаёміць вя толькі з тэхнічнымі ведамі, але і з аховаю ад няшчасных выпадкаў на працы. Карысна сельскагаспадарчым тэхнікумам, калгасным кадрам і ўсім, хто працуе з машынамі.

Іерусалімскі В. і Пескін Я.—Бягучы рамонт трактароў. (Пераклад з расійскае мовы).

Дае ў папулярнай форме практычныя заўвагі, як рамантаваць трактары, як пазнаць папсаваныя яго часткі і як іх папраўляць. Кніжка дапамагае аўладаць тэхнікаю. Разьлічана на трактарыстаў і брыгадзіраў трактарных калён.

Ліўшыц Я. Б.—Забіваньне сьвіней, прадукты сьвінагадоўлі і хваробы сьвіннога мяса. (Пераклад з расійскае мовы).

Напісана папулярнаю моваю. Карысна сельска-гаспадарчым тэхнікумам і ВНУ (жывёлагадоўчым), колгаснаму і саўгаснаму актыву.

Нікуліхін Я. і Караваеў А.—Зборнік. (Пераклад з расійскае мовы).

Напісана навуковымі працаўнікамі Навукова дасьледчага колгасн. інстытуту і спэцыялістмі трактарацэнтру. Напісана паводле заданьня НКЗ СССР. Кніга скарыстоўвае матэрыял вопыту першага году разгорнутай суцэльнай колектывізацыі і матэрыялы вясны 1931 году. Яе можна раіць кіраўнікам раённых організацый (РК, РВК), спэцыялістым МТС, старшыням буйных колгасаў, кіраўнікам саўгасаў, студэнтам (с.г. ВНУ і с.г. тэхнікумаў.

Круглоў і Рачэўскі.—Ахова здароўя сельска-гаспадарчых жывёл.

Напісана папулярна, ясна, вытрымана з спэц. боку. Карысная нізавым кадрам колгасаў і саўгасаў.

Горын А.—Як выводзяцца новыя сарты сельска-гаспадарчых расьлін.

Напісана ясна і папулярна. Знаёміць з тым, як выводзяцца новыя сарты з селекцыйна-насенаводнай працы.

ВАЙСКОВЫ СЭКТАР.

Як здаць іспыт назначок „Гатоў да працы і абароны".

Падручнік для кожнага фізкультурніка, які хоча здаць нормы на значок „Гатоў да працы і абароны", добра адказвае на патрабаваньні фізкультурных організацый.

Падводныя лодкі.

Элементарна і ў зразумелай масаваму чытачу форме аўтар знаёміць з гісторыяй зьяўленьня падводных лодак з іх пасьлядоўным ўдасканаленьнем і тэю роляю, якой яны адыгрывалі ў імпэрыялістычную вайну. Кніжка знаёміць чытача, як капіталістычныя краіны старанна будуюць свой падводны флёт і шалёна рыхтуюцца да новае вайны. Для чырвонаармейца і рабочага.

Патроў Л.—Работа сярод насельніцтва прыфрантовай паласы.

Кніга дае абагульненьне практыкі палітработы сярод насельніцтва ў час грамадзянскай вайны і баявых дзеяньняў за апошні час АЧДУА. Карысная для начскладу і активу ТДАвіяхэму.

Качэлін М.—Вопыт партыйна-палітычнай работы ў мота-механічных частках.

Кніга дае некаторую практыку шэрагу работнікаў мота-механізаваных частак на партыйнай і палітычнай рабоце ў час манэўраў, заняткаў на полі і інш. Патрэбна комполітскладу мото-мэхчастак.

Алкалаеў В.—Стралковы спорт. ч. 1-я. (Пераклад з расійскае мовы).

Дае кароткія ве ткі па тэорыі страляньня, неабходны дапаможнік членам і інструктарам стралковых гурткоў. Шырока скарыстана багатая практыка па стралковаму навучаньню дынамаўскае школы.

Бубноў А.—Хэмія і бронясілы. (Пераклад з расійскае мовы).

Сьцісла падаецца гісторыя танкавае барацьбы ў цеснай сувязі з разьвіцьцём іншых сродкаў тэхнічнае барацьбы. Асноўная тэма: дзеяньні хэмічных і танкавых частак, як супольна, так і адна супроць аднэй. Нап сана вельмі папулярна. Разьлічана на чырвонаармейца ўсіх адмен войск.

Дзюбінскі С.—Як орган заваць падрыхтоўку чырвонаармейца да політзаняткаў. (Пераклад з расійскае мовы).

Памятка малодшаму камандзіру ў яго рабоце па падрыхтоўцы чырвонаармейцаў да палітзаняткаў, дае малодшаму камандзіру сыстэматызаваны матэрыял па гэтым пытаньні. Бясспрэчна патрэбная брошура.

Гураў С.—Бой дробных частак пяхоты. (Пераклад з расійскае мовы).

Коратка падаюцца асноўныя палажэньні работы начальніцкага складу аддзяленьня і зводу пяхоты ў важнейшых выпадках баявых абставін, настаўленьне, абарона, разьведка, паходная і вартавая ахова. Зьмест ілюструецца шматлікімі прыкладамі і задачамі. Увесь матэрыял грунтуецца на пэўных статутных палажэньнях і дапасоўвае іх да пэўных выпадкаў баявых абставін. Разьлічана на начальніцкі склад пяхоты, коньніцы, кадраў запасу і на вайсковыя школы.

Ігнатаў Н.—Прожэктары і гукаспаймальнікі.

Кніга знаёміць з адным з шматлікіх адмен тэхнікі, што будзе адыгрываць у будучай вайне адну з рашаючых роляў,—пражэктарамі і гукаспаймальнікамі. Разьлічана на чырвонаармейца і ТДАвіяхімаўца.

Фёдараў В.—Дэгазацыя і як яе праводзіць. (Пераклад з расійскае мовы).

Знаёміць чытача з уласьцівасьцямі баявых атрутных маэтрый, галоўным чынам, з матэрыямі катэгорыі стойкіх, а таксама з спосабамі дэгазацыі мясцовасьці, адзеньня, ежы і вады. Коратка знаёміць з пабудоваю прылад для дэгазацыі і работаю з імі. Разьлічана на масавага чытача і будзе карысна ў падрыхтоўцы да абароны наогул, а таксама і ў справе асабістай абароны—гэтаму прысьвечан адмысловы разьдзел.

Ракіцін Н.—Запіскі конармейца. (Пераклад з расійскае мовы).

Аўтар расказвае, як ён прайшоў шлях ад афіцэра часоў імпэрыялістычнае вайны да камуніста і камандзіра ў Першай Коннай Арміі. Кніга багатая фактычным матарыялам, пра паходы і бойкі героічнае арміі.

ЮНДЗЕТСЭКТАР.

Маўр Янка.—Чалавек ідзе.

У фантастычным апавяданьні аўтар дае малюнак жыцьця гуртка першабытных людзей. Ярка і цікава паказаны моманты змаганьня першых людзей за свае існаваньне і паступовы пераход да карыстаньня прыладамі, агнём і г. д. Кніжка карысная і цікавая. Дае дзецям старэйшага ўзросту шмат каштоўнага матарыялу.

Маўр Я.—Савецкая кватэра.

Апавяданьне пра пабудову новага дому для рабочых. Для малодшага ўзросту. Добра ілюстраваная.

Воўкаў і Станкевіч.—Гомсельмаш.

Брошура прыстасаваная для дзяцей з мэтаю політэхнічнага выхаваньня.

Чумачэнка.—Як чалавек выдумаў бога. (Пераклад з расійскае мовы).

У жывых і дасту́пных дзецям нарысах расказваецца пра паходжаньне і ролю рэлігіі. Шмат ілюстрацый для сярэдняга і малодшага ўзросту.

Ломаў.—У дні буры і націску. Кароткія і яскравыя ўспаміны пра кастрычнік у Ленінградзе і Маскве бліжайшага ўдзельніка падзей, члена ЦК, таго часу т. Ломава.

Гарнест Корнад.—„СІМ" (Соцыялістычны Інтэрнацыянал Моладзі).

Дае знаёмства і орыентацыі ў гэтым пытаньні. Разьлічана на старэйшы юнацкі ўзрост.

Гарэлік І.—Пэдолёгія на дапамогу піянэр рабоце. (Пераклад з расійскае мовы). Разьлічана на пэдагагічныя кадры, як мэтодычны і практычны дапаможнік у рабоце сярод піонэр-організацыі і школьнікаў.

Штэрнік Р.—Менск-чырвонагальштучны. Пра апошні піянэрскі зьлёт.

Дрожжын.—Разумныя машыны. (Пераклад з расійскае мовы).

Расказваецца пра машыны аўтаматы, якія працуюць цяпер у Эўропе і Амэрыцы. Адны з іх бачаць, другія вартуюць склады, трэція—пажарнікі, чацьвертыя кіруюць вулічным рухам і г. д. Для юнацкага ўзросту.

Вечар А. Сын вясны.

Твор малюе клясавую барацьбу на вёсцы.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА.

Кузьміч В.—Караблі. (Пераклад з украінскае мовы).

Кніга таленавітага ўкраінскага пісьменьніка нашае сучаснасьці. Зьмест: гады грамадзянскае вайны, змаганьне нашага флёту супроць белагвардзейцаў і інтэрвэнцыі, цікавыя эпізоды гэтага часу.

Таўбін Юлі—Таўрыда. (Поэма).

Дае малюнак жыцьця працоўнае яўрэйскае беднаты ў былой Расійскай Імпэрыі, эміграцыі беднаты ў Амэрыку і потым жыцьцё ў яўрэйскай камуне.

Мозэс Рафаль і Леў.—З краіны роспачы ў краіну надзей. (Пераклад з ангельскае мовы).

Яскрава малюе некаторыя бакі так званай „амэрыканскай дэмократыі", паказваючы яе адваротны бок.

Купала Янка.—Адплата каханьня.

У зборніку зьмешчаны поэмы: „Яна і Я", „Магіла льва", „Адплата каханьня" „Зімою" „У піліпаўку", „У купальскую ноч" і „І Два браты".

Купала Янка.—„Было гэта". (Вершы).

У зборніку зьмешчаны творы напісаныя паэтам да рэвалюцыі. Асноўны матыў—соцыяльнае і нацыянальнае прыгнечаньне на Беларусі.

Крапіва.—Крапіва (4-е выданьне).

Зьмест: Популярныя байкі Крапівы, зьмешчаныя ў старых выданьнях крыху папраўленыя і дапоўненыя і новыя творы гэтага году.

Мархвіца.—Штурм Эссэнна. (Пераклад з нямецкае мовы).

Даецца малюнак узброенага паўстаньня рабочых Рура ў час Капаўскага путча ў 1920 г. Выяўляецца здрадніцкая роля Нямецкага с-д. як непасрэднага абаронцы буржуазіі і капіталістычнага ладу.

Іофэ Ю.—У вялікім нэпаўскім двары. (Пераклад з яўрэйскае мовы).

Адлюстроўваецца клясавая барацьба на фоне яўрэйскага быту і паказваецца рост элемэнтаў соцыялізму ў змаганьні з рэшткамі капіталістычнае гаспадаркі. На гэтым фоне выводзіцца рад колёрытных фігур з яўрэйскага працоўнага асяродзьдзя, а таксама з нэпманскага паразытычнага пласту насельніцтва.

Гільдзін А. Калодзежы. (Пераклад з яўрэйскае мовы).

У цэнтры кнігі стаяць апавяданьні, якія адлюстроўваюць працэсы соцыялістычнае рэконструкцыі і жыцьця партыі. Кніга атрымала прэмію Украінскага НКАсьветы, як адна з лепшых кніг яўрэйскіх і пралетарскіх пісьменьнікаў ў УССР.

Гардынін.—Чалавек з вінтоўкаю. (Пераклад з яўрэйскае мовы)

Тэмы: Грамадзянская вайна, раскладаньне старой царскай арміі і нараджэньне Чырвонай Арміі, партызанскае змаганьне за саветы.

Гартны Цішка.—Гоман зарніц.

Апавяданьні паводле тэматыкі падзяляюцца на тры групы: а) жыцьцё рабочых, б) колектывізацыя вёскі і в) жыцьцё замежных пролетарыяў. Найлепшае апавяданьне „Гаспадар", дзе даецца вобраз дбайнага рэволюцыйна-сьвядомага рабочага.

Бобрык Янка.—Рэспубліка кліча.

У зборніку зьмешчаны вершы: „Трывога", „Песьня ўдарніка" „Ганэраныя", „Галіна" „Пра мінулае", „Пра песьню і дзяўчыну", „Бацьку", „Кружацца думкі".

Райсін.—„Непакорныя".

Апавяданьне разглядае вельмі цікавае пытаньне, яшчэ не закранутае ў беларускай літаратуры—„Віленскую трагэдыю", калі група комуністаў і комсамольцаў, выкарыстаўшы ўсе сродкі абароны прымушана была скончыць самагубствам. Апавяданьне цікавае і карыснае. Кожнаму камсамольцу і юнаку, чытаецца з цікавасьцю і дарослымі.

Бужан Х.—Лясьнікі.

Першая аповесьць аўтара пачынальніка, малюе жыцьцё, працу і быт лясных работнікаў і сялян на лесараспрацоўках, клясавае змаганьне на „лясным" фронце. Чытаецца з цікавасьцю.

ЭКПРАЎСЭКТАР.

Канаплін.—Горсаветы БССР ва ўмовах рэканструкцыйнага пэрыяду.

Завастрае ўвагу на вельмі актуальных політычных пытаньнях, на конкрэтных фактах з працы Горсаветаў БССР, паказваецца, як павінны перабудаваць яны сваю работу для сапраўднага бальшавіцкага вырашэньня задач, што вызначаны Сьнежаньскім і Чэрвенскім Пленумамі ЦК УсеКП(б). Вывады грунтуюцца пераважна на мясцовым матэрыяле, на дзейнасьці асноўных Гарадзкіх Саветаў БССР.

Джэрманетто Д.—Італія—якая яна ёсьць.

Кніжка знаёміць чытачоў з становішчам прамысловых і с.-г. рабочых фашысцкай Італіі.

Вінаград Б.—Днепрабуд. (Пераклад з расійскай мовы).

Дае поўнае ўяўленьне вялікага эканамічнага значэньня Днепрабуду, паказвае героічнае змаганьне рабочых за сканчэньне будаўніцтва ў вызначаны плянам тэрмін, характарызуе мэтады і мэханізацыю будаўнічых работ, дапаможныя прадпрыемствы і прамысловы камбінат, які будзе пабудаваны. Асьвятляецца гісторыя ўзьнікненьня „дняпроўскае" проблемы ў дарэвалюцыйны час і чаму царскі ўрад ня здолеў гэту проблему ажыцьцявіць. Напісана популярна і даступна масаваму чытачу.

„Камбінаваньне ва ўмовах капіталізму і ў СССР.

Кніжка складаецца з двух дакладаў (т.т. Тэрліна і Бланка), па пытаньнях камбінаваньня і дыскусій па іх, што адбыліся ў Інстытуце прамыслова-эканамічных дасьледваньняў ВСНГ СССР, дзе тэорэтычна ставіцца проблема камбінаваньня.

Саратоўцаў П.—Крах сусьветнае валюты. На невялікай колькасьці фактаў выяўляецца глыбіня імпэрыялістычнага загніваньня ангельскага і сусьветнага капіталізму, падзеньня фунта-стэрлінгаў, як сусьветнае валюты, што ўносіць дэзорганізацыю і абясцэньвае валюту на сусьветным рынку. Разьлічана на парт. і проф. актыў.

.нсараў.—За соцрэконструкцыю воднага транспарту.

Даецца аналіз рачнога транспарту, яго становішча, роля і пэрспэктывы. Брошура популярная і каштоўная зьместам.

Піцерскі Г. і Розанаў.—Як зьнішчыць ураўнілаўку. (Пераклад з расійскае мовы).

Прыкладамі паказваецца, як на падзе прадпрыемстваў сказілася лінія партыі ў галіне заработнай платы і гэтыя скажэньні былі тормазам у справе падвышэньня вытворчасьці працы кваліфікаваных рабочых і прывялі да цякучасьці рабочае сілы. Ставіцца задача разгортваньня жорсткае барацьбы за ліквідацыю ўраўнілаўкі ў заработнай плаце і колектыўнай зьдзельшчыне.

Гаўрыкаў В. і Гарадзецкі С.—і інш.—Гэроіка будняў. (Пераклад з расійскае мовы).

Нарысы гэтай кнігі даюць яркія прыклады творчага энтузіязму рабочых саўгасаў і колгасьнікаў у змаганьні за пабудову соцыялістычна-сельскае гаспадаркі і паказваюць новага чалавека.

Выдавец—Кнігасэктар ДВБ. Адказны Рэдактар Я. Клейнэр.

Друк. імя Сталіна. Зак. № 192 ~~205683~~ 60164 1.000 экз. Галоўлітбел № 48.